**ПЕСЕННЫ ФАЛЬКЛОР МАГІЛЁЎШЧЫНЫ.**
**ХОЦІМСКІ РАЁН.**
**СУЧАСНЫЯ ЗАПІСЫ.**

**д.Енаполье** **Ламекина Галина.Павловна 1940 г.**
**Буденкова Нина.Савельевна. 1935 г.**

*1.* */Бяседная/*
2.
Па небу тучы, па небу хмары,
Па небу сінем, галубом.
Маё сярдечка дасаду чуець
Што мілый ходзіць за другой./2 р/

2.
А ён усё ходзіць, а я усё знаю,
Сабе пакою не даю.
А я яго люблю, па ём страдаю
Любіць заставіць не магу. /2 р/

3.
Калі б ты месяц, калі б ты ясны,
Калі б ты звечара свяціу.
Калі б ты мілы ды быу харошы
Калі б што вечар прыходзіу. /2р/

4.
Хараша у моры купацца,
Калі халодная вада.
Ой, хараша у того улюбляцца,
Хто не кідае ні калі. /2р/

*/Бяседная/*

Ой на гаре на той, на крутой
Там сядзела, гуляла пара галубоу – 2 раза.
А яны сядзелі, парываліся,
Сваімі крыламі абдымаліся. – 2 раза.
А, адкуль узяуся ахотнік-стралец,
Ён убіу, разлучыу пару галубей. – 2 раза.

А ён голуба убіу, галубку узлюбіу
Ён узяу пад палу і панёс дадому. – 2 раза.
А галубка ня п`ець, галубка ня есць.
На крутую горачку усё плакаць ідзець – 2 раза
А галубка мая сізакрылая,
Ай чаго ж ты такая клапатлівая? – 2 раза
Ай як жа мне клапатлівай ня быць,
Ай была ж то у нас пара, а цяпер я адна. – 2 раза.
А ёсць у мяне сем пар галубей.
Прылятай, выбірай, каторы мілей – 2 раза.
Ня тое пяро, ня тое крыло
І не так ён гудзець, як да мяне ідзець – 2 раза.

*/Бяседная/*

А вы ветрыкі, вятрочкі
Не шуміце-ка й нада мною
Не шуміце-ка, ой, да нада мною,
Над дзяучоначкаю-сіратою.
Пашуміце-ка, ой, ля Дунаю
Я пайду з міленькім пагуляю.
Пайду з міленькім пагуляю
Каля ціхага ля Дунаю.
Каля ціхага Дунаю,
Дунай ціхенькі ускалыхнууся.
Дунай ціхенькі ускалыхнууся,
Гусі серыя устрыпянулісь /2 р./
Устрыпянуушыся – паляцелі.
Устрыпянуушыся, ой, паляцелі?
Галасюшэнька закрычалі,
Галасюшэнька, ой, закрычалі.
Ды й пра мілога расказалі,
Ды й пра мілога, ой, ды расказалі.
Што мой міленькі п`ець, гуляець,
Што мой міленькі, ой, п`ець, гуляець.
Хвацерушачка небальшая,
Хвацерушачка, ой, небальшая,
Хазяюшка маладая.

*************

Радзілася я, дзевіцей красівай
Судзьба не дала, долі мне шчаслівай. –2 раза.
Я з 12-ці гадоу, па людзях хадзіла,
Дзе качала я дзяцей, дзе кароу даіла.-2 раза.
Хараша я хараша, дый плоха надзета,

Ніхто замуж ні бярэць, дзевачку за ета - 2 раза.
Пайду з горя у манастырь, богу й памалюся,
Перад іконаю святой, слязою баллюся. –2 раза.
Радзілася я, як былінка у полі,
Мая й моладасць прайшла, па людзях у няволі.- 2 раза.

* * *

Ты вецер, ды й вецярочек, з далёкага краю й
Павей, вецер, ды й вецярочек з далёкага краю.
Прыходзь, мілы, ды чарнабрывы, з далёкага краю.-2 р.
Ой рад бы я дый пабываці, край дужа далёк.-2 раза.
А у нашым ды й калодзісі  халодныя ключы.-2 раза.
Надаела, надаскучыла, два гадочкі ждаці-2 раза.
Ждала й год, ждала і другі, ды й ждаці не стала-2 раза.
Папрасіла, ды й чорны воран, пісьмо перадаці –2 раза.
Перадайце, ды маёй мілай, пусць яна не плачыць.-2р.
А няхай жа йна, ды й замуж ідзе, а я ажанюсь. – 2 раза
А няхай яго ды й ажыняець, ціхая родзіна. – 2 раза.
А звязалі ды й мае ручкі, а малое дзяціня –2 раза.

* * * *

*/вясельная/*

У варот бяроза стаяла, Ніна й са двара з`язжала. –2 р.
Бярозаву ветачку сарвала.-2 раза.
Стой мая бяроза да верху - 2 раза.
Жыві мая мамачка без мяне. – 2 раза.
Без русый касы, без маей,    -2 раза.
Без шауковага вяночка, –2 раза.
Што у русай касе насіла – 2 раза.
Йна горя маё красіла, -2 раза.
Цяпер некаму красіці –2 раза.

************************************************************************

**д.Роскошь** **Шалупина Мария Карповна  1938г.**

*/бяседная/*

З-пад гор-гары ручей котиться
Ой ли, ой люли, ручей котиться.
А дочка в мамачки гулять просится:
«Пусти, мамачка, на ручей гулять,
Ой ли, ой люли, на ручей гулять.

На ручей гулять, соловьёв считать,
Ой ли, ой люли, соловьёв считать.
А у саколика голова болить,
Ой ли, ой люли, голова болить.
Чем саколику галаву лечить?
Ой ли, ой люли, галаву лечить?
Ой, ти бабами, ой, ти старыми,
Ай, ти девками, ой, ти красными,
Ой ли, ой люли, ой, ти красными».

* * *

Ой, зялёней дуба
Ой, зялёней дуба
У ва всем лесе нет.
Ой,что милей друга,
Ой, что милей друга
Ва всем свете нет.
Ой, як я спать ляжу
Ой, як я спать ляжу
Спать няхочыцца
Ой, спать няхочыцца.
У ва сне бачыцца
Ой, а что мой терем
Ой, а что мой терем
Растворен стоить.
Ой, а што мой милый,
Ой, а што мой милый
Са другой стаить.

* * *

Нарадз1ла мац1 1вана
У зялёнай дубров1.
Нарадз1ла мац1 1вана
У зялёнай дубров1.
А не дала мац1 1вану
Н1 шчасця, н1 дол1.
Толька дала мац1 1вану
Усё чорныя бров1,
Тольк1 дала мац1 1вану
Усё чорныя бров1.
А за тыя чорныя бров1
У салдац1к1 узял1,
А за тыя чорныя бров1
У салдац1к1 узял1.

1ванечку мац1
Выла-галас1ла.
1ванечку мац1
Выла-галас1ла.
А йна выла-галас1ла
Долечку прас1ла.
Ой, дай жа ты, Божа
1ванечку долю,
Ой, дай жа ты, Божа,
1ванечку долю.
Ай, 1ванечку долю
Парню маладому.

* * *

Гыня, гыня, серыя гус1 на ваду
Скушна ж табе, с1лязенька, аднаму
Скушна табе, с1лязенька, аднаму.
Павялося у яго перья па яму.
Но ня пер`я, а то девіч`я краса
А у дзяучыны не зачэсана каса.
А у дзяучыны не зачэсана каса.
І заплаканыя карыя глаза.
А, йна учора нездаровенька была
І у ночы сабе сына радзіла.
Ты расці, расці атрадный сынка
Ідзі Ленінскай дарогаю прямой,
Ідзі Ленінскай дарогаю прямой
Што бы Родзіна гардзілася табой.

* * *

*/вясельная/*

На морі вутачка купалася,
На морі вутачка купалася.
У каморі дзевачка сабіралася,
У каморі дзевачка сабіралася.
Падышла мамачка пыталася,
Й падышла родная пыталася:
«Куда ж ты, дачушка, сабіраешся,
Куда ж ты дачушка, сабіраешся.
Ай ці у бор, шчырый бор пы ягадкі,
Ай ці у бор, шчырый бор пы ягадкі,
Ай ці у луг зялёный па красачкі,

А у луг жа зялёный па красачкі?»
«А што ж ты, родная, пытаешся?
Прапіушы, прагуляушы, насьміхаешся.
Прапіушы, прагуляушы, насьміхаешся».

*  * * *

Из-за лесу, из-за высоких тёмных гор,
Он скамандывал: «Ребята все за мной.
Вы ребята не рабей, да не рабей,
А седлайте сваих вораных каней.
А седлайте сваих вораных каней
Дый паедим на засаду паскарей,
На засаде мы прабыли три часа.
Пули сыпали, жужжали як пчала
Пули сыпали, жужжали як пчала
Адна пуля праляцела, да праз меня
Адна пуля праляцела, да праз меня
Йна не убила, йна не ранила меня.
Йна не убила, йна не ранила меня.
Толька убила йна фашиста-дурука
Толька убила йна фашиста-дурука
Кров горячая ручейкую плыла.
Кров горячая ручейкую плыла.
Из падбита чарна-ворана каня.

* * *

Ой у полі, у полі сцеліцца нізка туман
Там па зялёнаму гаю
Хлопец з дзяучынай гуляу.
Там па зялёнаму гаю
Хлопец з дзяучынай гуляу.
Гулялі яны, гулялі,
Цыганачка к ім падышла:
«Дай-ка мне правую руку
Прауду скажу табе я.
Дай-ка мне правую руку
Прауду скажу табе я.

Парень жа ты чернаглазы
Не звадзі дзяучыну з ума,
Бедная йна сіраціна –
Бацькі і маці няма,
Бедная йна сіраціна –

Бацькі і маці няма».

«Не прауду ты кажыш,цыганка,
Я крепка дзяучыну люблю
Нежна яе я кахаю,
Блізка да сэрца пріжму,
Нежна яе я кахаю,
Блізка да сэрца пріжму».

Цыганачка з гаю не выйшла,
Прауду сказала у глаза,
Там па зялёнаму гаю
Гуляла дзяучына адна,
Там па зялёнаму гаю
Гуляла дзяучына адна.

Ой, па зялёнаму гаю
Гуляла дзяучына адна,
А на руках у дзяучыны
Плачыць малое дзіця.
А на руках у дзяучыны
Плачыць малое дзіця.

* * *

Ай дуб да бярозы нізенька схіліуся,
Ай дуб да бярозы нізенька схіліуся,
А сынок у бацькі жаніцца прасіуся.
А сынок у бацькі жаніцца прасіуся.
«Жані мяне, бацька, жані маладога
Жані мяне, бацька, жані маладога,
А калі ты ня жэніш, я сам ажанюся
А калі ты ня жэніш, я сам ажанюся»
Вазьму сабе дзеуку, з каторай люблюся
Вазьму сабе дзеуку, з каторай люблюся.
«Вазьму з панараву, штоб вочачкі кары,
Вазьму з панараву, штоб вочачкі кары,
Вазьму з палюбові, штоб чорныя бровы,
Вазьму з палюбові, штоб чорныя бровы».
«На-ка табе, сынку, рубля залатога
На-ка табе, сынку, рубля залатога,
Купі сабе, сынку, каня варанога,
Купі сабе, сынку, каня варанога.
Пастау яго, сынку, у новую стойню,
Пастау яго, сынку, у новую стойню»

Стаіць коню ночку, стаіць і другую.
Стаіць коню ночку, стаіць і другую.
На трэццюю ночку мой коня гаворыць,
На трэццюю ночку мой коня гаворыць:
«Майму хазяену гарэлка ня п`ецца,
Майму хазяену гарэлка ня п`ецца,
А мне вараному сена не кладзецца,
А мне вараному сена не кладзецца».
«Ай коня, мой коня, што ж табе цяжола,
Ай коня, мой коня, што ж табе цяжола?»
«А мне не цяжолы ні  вазы, ні бочкі,
А мне не цяжолы ні  вазы, ні бочкі,
Толькі мне цяжолы все твае пірочкі.
Толькі мне цяжолы все твае пірочкі.»

* * * *

Ціха над рэчкаю Волгай, дзе мы сядзелі удваём
Там твае карыя вочы нежна гарэлі агнём
Там твае карыя вочы нежна гарэлі агнём
Дзяучына мая ты кахана, верна цябе я люблю
Спяшу я к табе на свіданне, аткрыю усю тайну сваю
Хацеу бы цябе я пасватацъ, і веку з табою дажыць
Но жаль мая старая маці, брацъ мне цябе не вяліць
Но жаль мая старая маці, брацъ мне цябе не вяліць
Сёння любімый сыночак, слухай што буду казацъ,
Многа на свеце багатых, можыш багачку ты узяць
Гуляу я з багачкай у чаечку, і слухау яе галасок
Выйшла яна дый спяваіць, аж на рачны беражок
Выйшла яна дый спяваіць, аж на рачны беражок
Выйшла яна дый спяваіць, любіш багачку, любі
А ты Волга рэчка шырока, хвалей мяне прыгарні.
А ты Волга рэчка шырока, хвалей мяне прыгарні.
Пабег я на бераг быстрэнька, а рэчка Волга шуміць
Тут дзета упала дзяучына, па ёй маё сэрца баліць
Тут дзета упала дзяучына, па ёй маё сэрца баліць
І выняу дзяучыну на бераг, дзяучына ужо мёртва была
Сэрца у яе ужо не білась і не ласкала меня
Сэрца у яе ужо не білась і не ласкала меня

* * * *

Раскажуж табе кума, як Макар сышоу с ума
О-о-о-о, як Макар сышоу с ума.
Ай Макарава жана беззаботная была
А йна печку не тапіла і Макара не карміла

О-о-о-о-о, і Макара не карміла.
Усё хварала, усё балела, і сама пачці ня ела
Па карчашкі  малака, сразу па трі пірага
О-о-о-о-о, сразу па трі пірага
А Іванова жена, рукодельніца была
У яе у парадке хата, сыты, веселы ребята
Муженёчек наряжён, вот такіх ішчыце жон
О-о-о-о-о , вот такіх ішчыце жон.

* * * * *

Была у папа кабыла
Была у папа хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке кабыла.
Поп паехау да млына
Поп паехау хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке да млына.
Здохла яго кабыла
Здохла у яго хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке кабыла.
Стау ён жонкі жаліцца
Стау ён жонкі хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке жаліцца.
Стала жонка плакаці
Стала жонка хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке плакаці
Не плач жонка не журысь
Не плач жонка хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке не журысь.
Будуць з касцей пасцеля
Будуць з касцей хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке пасцеля.
Будзіць з мяса вячэра
Будзіць з мяса хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке вячэра.
Будуць з кожы сапагі
Будуць з кожы хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке сапагі.
Будуць з капыт каблукі
Будуць з капыт хурдалі пазахурдаль хурды вердалі
Пра да далінушке каблукі.

* * * * * *

Сама я няугледзіла
Калі моладасць прайшла
Калі моладасць прайшла

А як моладасць прайшла
З мілым разлучылася
З мілым разлучылася
З мілым разлучылася.
З нялюбым жанілася
З нялюбым жанілася
З нялюбым жанілася.
Дзетачык ряшылася
Дзетачык ряшылася.
Ай татачка, татачка
А дзе ж наша мамачка?
Ай дзе ж наша родненькая
Ай дзетачкі,дзетачкі
А вун ваша мамачка
Па саду пахажываіць
Па саду пахажываіць
Вішанькі пашчыпываіць,
Ай вішанькі пашчыпываіць
Ой татачка, татачка
Таж не наша мама
То наша разлучніца
То наша разлучніца
Твая палюбоуніца.
А вун наша мамачка
Пад пнёмпад калодаю
Накрыта саломою

**ФОЛЬКЛОРНЫЙ АНСАМБЛЬ**

**«Медуница» д. Клин**

1. Гавриленко Нина.Афанвсьевна. 1943 г.
2. Деменкова Нина.Павловна. 1937 г.
3. Малыгина Нина.Павловна. 1938 г.
4. Сидоренко Нина.Трофимовна. 1932 г.
5. Свириденко Александра.Савельевна. 1930 г.
6. Баланденко Зинаида Артемовна. 1947 г.
7. Кузьменкова Вера .Алексеевна. 1964 г.
8. Привалова Мария.Петровна. 1962г.
9. Иванов Андрей.Александрович. 1973 г.

10.Потехина Наталья Николаевна 1968г.

Мела хату і сені два голубі ляцелі.
Ой ты голуб галубок
Ляці у маю старану
Накажы роду маему

Накажы роду маему,
Што я туты гарую
Без мамачкі без сваёй
Без родненькай без сваёй.

Як пайду я в чыста поле
Сваю мамачку шукаць
Усю даліну абашла
Нідзе маму не знайшла
Толькі знайла даліну
Мамачкіну магілу.
Ручачкімі абняла
Слёзачкімі абліла
Устань маці, не ляжы
Жыцці горю памажы

Цішы дочка не гукай
Жыць у горы прівыкай
Ой рада б я устаці
Твайму гору памочы
Ой жоутыя пясочкі
Засыпалі мне вочкі
Дубовыя достачкі мне
Сціснулі ножачкі.

* * * * * *.

Эй, усе дубы-бярозачкі
Усе рядам стаяць,
Паслухай жа, мілы,
Што пра нас гаварацць.
Гаварацць жа людзічкі,
Што нас разлучыць хацяць,
Гаварацць жа людзічкі,
Што разлучыць хацяць.
На дваре же дожджычак –
Сільная роса.

На красную жа дзевіцу
Усе гора-таска.
А чаго ёй горачка,
Што мілы кідае.
Пакідае міленькі
А вот час і на час.
Седлае ён коніка
Сейчас, сейчас.
Напой, дзеука красная
Ворана каня.
Скажы, дзеука красная,
Ці кахаеш меня.

******

Ой, у садзе, у садочку
Калыхала Марусенька
Сына 1 дочку.
Калыхала, калыхала,
Пакуль у яе руках
Мята прызавяла.
Прызавяла-прызасохла,
Ц1 я у цябе, мая мац1,
Не дарасла.
Не дарасла, расц1 буду.
Палюб1ла, люб1ць буду.
Ты сястра, мая сястрыца,
Пакалыхавай дз1цяц1
Моё м1ла.
«Я не буду калыхац1,
Было табе з дабравольцам
Не гуляц1».
«Дабраволец-чарнабровец
Не адну мяне маладую
З ума зводз1ць.
З ума зводз1ць – не баюся,
Есць у пол1 куст кал1ны –
Прых1люся».
Кал1начка расцв1лася,
На горачка дз1ця радз1лася.

* * * *.

Як у нашым садз1ку
В1шын многа.
Ой, гнула я в1шынку –
Не сагнула.
Лягла я пад в1шынку,
Ды саснула.
Прыехау мой м1леньк1,
Я не чула.
«Устань, устань, м1лая,
прабудз1ся,
па зяленым садз1ку
прайдз1ся,
на маей калясачк1
пракац1ся,
мая калясачка не прастая,
мая калясачка залатая».

*    *    *

1 сюды гара, 1 туды гара,
Между тым1 крутым1 гарам1
Кац1лася заря.
Гэта не заря,
М1лая мая,
Л1цо бела, ды чорныя бров1,
За вадой 1шла.
Дзеука ад вады, парень – да вады,
«Пастой, пастой, красна дзяучыначка,
Дай каню вады».
«Ай рада б я устаць, каню вады даць,
босеньк1я ножк1 – халодна ступаць».
«Я уск1ну парчу, ножк1 абвярчу,
Як прыедзем да дому,
Абутак куплю».
«Куп1 хоць сабе,
Есць у мяне бацька 1 мац1-
Яны купяць мне».

*    *    *    *

Як у лузе кал1на стаяла.
Пад кал1най Гал1на гуляла,
Пад кал1най Гал1на гуляла,
Яна ус1х казакоу зчаравала.
А аднаму казаку не шкодз1ць,
Ен, што вечар, да дзяучыны ходз1ць.
«Ой, Гал1на, л1цо румяна,

прым1 на нач мяне маладога».
«Ох, 1 рада цябе я прыняц1,
дык баюся казацкай я рады».
«Ты ня бойся, дзяучына н1кога,
Я на свеце н1 зрадз1у н1кога,
Ой, не уб1у я н1 пташку малую,
1 не здраджу цябе, маладую».
А дзяучына ад радасц1 уснула,
Пасмяяуся казача, не учула.
А дзяучына прыснула 1 плача,
А казача на кон1ку скача.

*　　*　　*

Я платочек з розавай каймою
Падарыла парню аднаму.
Штоб гэты розавы платочек
Мог напомн1ць аба мне яму.
Вось аднойчы еду я у вагоне,
Поезд мчыцца прама на Васток.
Ц1шыню у вагоне нарушая,
Паравозны тоненьк1 св1сток.
А на полке сп1ць савецк1 лётчык,
Малады, прыгожы паранек.
1 з кармана выпау незаметна
Вышываны розавы платок.
Я платок ц1хонька падабрала
1 гляжу на вышыуку сваю,
А пасля я летчыка-героя
Сваяго я друга узнаю.
Дваццаць год прайшло так незаметна,
Дваццаць год 1сполн1лась 1 мне,
А платочык з розавай каёмкай
Я не знаю, жыу ен 1л1 не.

*　　*　　*

Ой, гара, гара высокая,
А на табе, гара, чатыры сокала.
Чатыры сокала, ды пень бярозавы,
Гуляла Леначка у кофце розавай.
У кофце розавай, яшчэ цвяточкам1,
Слезы кац1л1ся ды ручаечкам1.
Ой, бяда, бяда, ды яка ж бяда,
Паехау м1леньк1,
Ды не сказау куда.

Паехау м1лы мой у края далёк1я
1 асталась я ды адз1нокая.
Ад атца, ад мацер1 ды аддалённая,
У цябе у м1лага я улюблённая.

* * *

А у гародзе верба расла,
А у гародзе верба расла,
Там гуляла дзеука-красна.
Яна красна, шчэ 1 крас1ва,
Яна красна, шчэ 1 крас1ва,
Яе доля не шчасл1ва,
Яе доля не шчасл1ва,
Яе доля не шчасл1ва,
Няма таго, што люб1ла.
Няма яго, шчэ не будзе,
Няма яго, шчэ не будзе,
Разлучыл1 злыя людз1.
Разлучыл1-разсудз1л1,
Разлучыл1-разсудз1л1,
Што б мы упару не хадз1л1.
А мы упару хадз1ць будзем,
А мы упару хадз1ць будзем,
1 друг друга люб1ць будзем.

* * * * *

Ой, пад вішанкай, ды пад дубчыкам,
Там гуляла дзяучына з сваім любчыкам.
«Ты, дзяучына мая, разскрасавіца,
Мне твая краса не на равіцца.
Бо твая краса не раждённая,
Бо твая краса падвядзённая.
Як 1 з беднай гуляу, дык па воле хадз1у,
Як з багатай гуляць стау, за рашотку папау.
За рашоткай сяжу, ды у вокны гляжу.
Ц1 паедзе паедзе любоу первая.
А яна едзе, яна йдзе,
Шчэ й букеты нясе, цвяты алыя,
Выручай ты мяне з турмы каменнай.

* * *

Бушавала пагодушка з моря
М1ма майго м1ленькага дома.
Не даспела дзверы адчын1ц1,

Там мой м1лы у парозе ста1ц1.
«Здраствуй м1ла, здраствуй чарнаброва,
Чый у цябе на руках дзяц1на?»
«Была у гаду тры ночк1 цёмненьк1х,
Была у гаду тры ночк1 цёмненьк1х,
Была у мяне цыганачка у доме.
Ай ня была, тры дн1 варажыла,
Ай ня была, тры дн1 варажыла,
А 1на сваё дз1ця пазабыла.
«Брэшаш, м1ла, брэшыш чарнабрыва,
Цыганскае дз1ця не такое,
Цыганскае дз1ця усё чорнае».
Нада м1ламу усю прауду казаць.
«Была у гаду тры ночы цёмненьк1х,
Начавау у мяне казак маладзеньк1.
Сядлай,м1лы, каня варанога,
Даганяй, м1лы, казака маладога».

*　　　*　　　*

Ой, у пол1, ой, у пол1, сцелецца белы туман.
Там, у зялёным гаёчку казак з дзяучынай гуляу.
Там, у зялёным гаёчку казак з дзяучынай гуляу.
Гулял1 яны там гулял1,цыганка да 1х падышла.
Дай, парень, бравую ручку, прауду скажу табе я,
Дай, парень, бравую ручку, прауду скажу табе я.

Казала, казала, сакол1к, н1 звадз1-ка ты дзеуку з ума,
Бо яна с1рац1на, 1 так няшчасная яна.
Бо яна с1рац1на, 1 так няшчасная яна.

Казача цыганк1 ня верыць, казача кахае яе,
1дз1-ка, зладзейка адцеда, не навадз1-ка ты сум на мяне.
1дз1-ка, зладзейка адцеда, не навадз1-ка ты сум на мяне.

Ой, у пол1, ой, у пол1, сцелецца белы туман.
Там жа у вёсцы прыгожай нядауна вяселле гуляу.
Там жа у вёсцы прыгожай нядауна вяселле гуляу.

*　　　*　　　*

Ой, кал1на, ой, мал1на, у рэчцы талая вада,
Раскажу я вам, падружк1, як папала я сюда.
Раскажу я вам, падружк1, як папала я сюда.

Як-та ранняю вясною парень бравый прыскакау,
Доуга мною любавауся, а тады з сабой узяу.
Доуга мною любавауся, а тады з сабой узяу.

Ён хацеу мяне кал1ну пасадз1ць у сваем саду.
Не давёз, на землю брос1у, думау, што я прападу.
Не давёз, на землю брос1у, думау, што я прападу.

Я за землю ухвац1лась, стала на наг1 сва1,
Я над рэчкай пасял1лась, дзе спяваюць салау1.
Я над рэчкай пасял1лась, дзе спяваюць салау1.

Трактарысты, камбайнеры кожны дзень бываюць тут,
Яны ветак не ламаюць, цвет кал1ны берагуць.
Яны ветак не ламаюць, цвет кал1ны берагуць.

Ты не дуй, халодны вецер, на мяне, на с1рату,
Нада мною сонца свец1ць, я па-прежнему цв1ту.
Нада мною сонца свец1ць, я па-прежнему цв1ту.

Ой, кал1на, ой, мал1на, у рэчцы талая вада,
Раскажу я вам, падружк1, як папала я сюда.
Раскажу я вам, падружк1, як папала я сюда.

**д.Боханы** **Филипенко Екатерина Федоровна 1934г.**

Што за томна, што за вредна?
Ой таж н1 етага не будз1ць
Таж н1 етага етага н1 будз1ць.
Ой, да мужык жоначк1 не люб1ць.
Аткасьн1ся й не любая
Ой да й у мяне ужо ёсць другая
Н1хау у цябе тр1, чатыр1,
Но я ж у цябе каренная.
А я у цябе каренная.
Ой. Да сва1м дзетачкам маць радная.
Скажы, скажы, мой м1леньк1,
Ой, да чым жа я табе надаела,
Ц1 хадою, ц1 ядою,
Ой, да ц1 ж сваею работаю.
На работачку хажу рана,
Ой, да хлеба-сол1чк1 бяру мала.

Хлеба-сол1чк1 бяру мала,
1 таго ж я не з`ядала.
А сва1м жо дзетачкам пр1нас1ла,
1 сва1х жа дзетачак я карм1ла.

*        *        *

*/пасхальная/*

Хр1стос Васкрес1
Смерц1, смерц1 прысушчей рабе Бог даравау.
Хр1стос Васкрес1
Смерц1, смерц1 прысушчей рабе Бог даравау.
Хр1стос Васкрес1
Смерц1, смерц1 прысушчей рабе Бог даравау.
Во Хр1ста, во Хр1ста хрясц1цеся
У Хр1ста бл1куйцеся
Ол1луя, ол1луя, ол1луя
Ой, 1сусе, сыне Божый,
Пам1луй нас!

*        *        *

З-пад гор-гары ручэй коц1цца
Ай, люл1-люл1, ручэй коц1ца.
А ручэй коц1цца, а гуляць хочацца,
Ай, люл1-люл1, гуляць хочацца,
Ой, пусц1, мамачка, ой, на ручэй гуляць.
Ай, люл1-люл1, ой, на ручэй гуляць.
А на ручэй гуляць, ды селязнеу в1даць.
Ай, люл1-люл1, ды селязнеу в1даць.
Ой, селязёначка, ды с1закрыленьк1,
Ай, люл1-люл1, ды с1закрыленьк1,
А скажы праудачку, а дзе ж мой м1леньк1?
Ай, люл1-люл1, а дзе ж мой м1леньк1?
А твой м1леньк1, ды са вайны прыйшоу.
А са вайны прыйшоу, ды на пасцелю лёг.
Ай, люл1-люл1, ды на пасцелю лёг.
На пасцелю лёг, дый забажау вады,
Ай, люл1-люл1, дый забажау вады,
Забажау вады, ды зы Дунай рək1,
Ай, люл1-люл1, ды зы Дунай ряк1,
А у первым час1ку я па ваду 1шла.
Ай, люл1-люл1, 1й па ваду 1шла.
А у другом час1ку я ваду чэрпала.
Ай, люл1-люл1, я ваду чэрпала.
А у трэцц1м час1ку а ка мне смерць прыйшла,

Ай, люл1-люл1, ды ка мне смерць прыйшла.
А што мой м1лэй ды перестав1уся,
Ай, люл1-люл1, ды перестав1уся.
А прыхажу дамой, на дворе гроб ста1ць,
Ай, люл1-люл1, на дворе гроб ста1ць,
А у тым гроб1ку а м1лый мой ляжыць.
Ай, люл1-люл1, а м1лый мой ляжыць.
А у галавах яго родна мацъ ста1ць,
Ай, люл1-люл1, родна маць ста1ць,
А у нагах яго ста1ць сястрычанька,
Ай, люл1-люл1, ста1ць сястрычанька,
А дзе маць ста1ць, а там река бяг1ць,
Ай, люл1-люл1, а там река бяг1ць,
А дзе сястра ста1ць, а там крын1чанька,
Ай, люл1-люл1, а там крын1чанька,
А дзе жана ста1ць, а там расы н1ма,
Ай, люл1-люл1, а там расы н1ма,
А вечарком пайду 1 семярых найду,
Ай, люл1-люл1, 1 семярых най

/Рэкруцкая/

Ноч прашла в полевом лазареце,
Дзе дзяжур1л1 доктар з сястрой.
Полумрачнам весеннем рассвеце
Ум1раець от раны герой.
Он сабравшы паследн1я с1лы
Он д1ктуець сястре, што п1саць.
А сам ён так страшна аб1жен к маг1ле,
Он ня хочыць семью пак1даць.
Вот жене вы моей нап1шыце,
Што я скуку хачу разагнаць,
Што я ранен быу у правую руку
1 письма не магу нап1саць.
Но снаряд праляцеу, разарвауся,
Атарвала асколкам плячо,
1 навек1 я з вам1 прашчаюсь,
1 цалую я вас гарячо.

*　　*　　*

Ой, хмелю, мой хмелю,
Хмелю зеляненьк1,
Дзе ж ты, хмелю, з1му з1мавау?

Дай не раск1дауся.
Ой, сынка, мой сынка,
Сынка мой, радненьк1й,
Дзе ж ты, сынку, ночку начавау?
Да й не разувауся.
«Начавау я ночку,
Начавау я другу,
Начавау я у дзеуцы,
Што сватац1 буду».

*     *     *

Ой, у пол1, у пол1
Сцелецца у пол1 туман.
Там у зяленым гаёчку парень з дзяучынай гуляу.
А йны гулял1-гулял1, цыганка к 1м падышла,
«Дай-ка мне правую ручку, пруду скажу табе я».
«А я цыганям не верю, м1лый так люб1ць мяне,
выйдз1, цыганачка, з гаю, слухаць не буду цябе».
Цыганка 1 з гаю не выйшла, стала яна на краю,
Чуець, як плачыць дзяучынка,
Плачыць у зялёным гаю,
«Казача, як1 ты бястыжый, не зводзь-ка дзяучыну з ума,
бедная йна с1рац1на, бацьк1 1 матк1 няма».
Ох, як у пол1, у пол1, у пол1 туману няма
Там, у зялёным гаечку ходз1ць дзяучынка скушна.
Там, у зялёным гаечку ходз1ць дзяучынка скушна.
На яе беленьк1х ручках плачыць дзяц1на мая.

*     *     *

Какая скушная пора – она меня пречеровала
Ой, на душе моей бальной галубкой нежной варкутала
Улетел голубчык мой меня оставил сиратою
Я, я страдаю, я люблю, я часто плачу за тобою
Когда б вернулся он ко мне кого я верна так любила
Не упрекнула б я его, и горе я как сон забыла
Но не вернётся он ко мне.И не вернутся больше чувства,
Он винават во всём один, так почему же слёзы льются.

****************************************************************************

**д. Малуновка**

**Чубакова Екатерина Ивановна 1907 г.**
**Толкачёва Анастасия Лавриновна 1928 г.**

Из под камня вода льётся
Туда-сюда павярнуся
Дивчёнка смеётся
Несмейсь, несмейсь девчёночка
Десяток таких маю
Одна идёт коня ведёт
Другая коня вяжет
Третья седло несёт
Четвёртая седлает
Пятая письмо пишет
Шестая читает
Седьмая бельё моет
Восьмая качает
Девятая песни поёт
Десятая рыдает

*/Жніво/*

А все людзі у двору ідут
А все людзі у двору ідут
Я малада не думаю
Я малада не думаю
Я малада не думаю
Як свайму ня любаму
Скінуся я малада
Скінуся я малада
Сераю зязюляю
Палячу я малада
Палячу я малада
К свайму ня любаму
Як сяду ямалада
Як сяду ямалада
Пад гольна акошачка
Паслушаю я малада
Паслушаю я малада
Што нялюбы гаворыць.
Што нялюбы гаворыць.
Што нялюбы гаворыць.
Калыхавшы дзетачку
«Баю-баю дзетачка
Баю-баю родная
Адзе твая мамачка?
Твая та родная.

А твая та мамачка
А твая та мамачка
На чужой на нівачкі
На чужой на нівачкі
На чужой на нівачкі
Пакладает сілачку
Чужая работушка
Чужая работушка
Отбрала охотушку.»
Слава табе божачка
Слава табе божачка
Што пачула словачка
Што пачула словачка
Што пачула словачка
Ат свайго міленькага.

**Слова положила на ноты Орлова Татьяна Юрьевна 1981г.р**

**Видеосъемка д.Варваровка (клуб)**
**танцы. (Сотникова Евдокия Кузьминична 1928г.р.)**

**Видеосъемка д. Беседовичи (сельский дом)**
**танцы, игры,песни. (Чибусова Матрена Григорьевна 1915 -1999г.)**

**Обряд «Мікольшчына» был записан со слов Грищенко Николая Никитьевича 1926г. д. Енаполье и Шалупиной Марии Карповны 1938г. д. Роскошь.**

**Обряд «Аўсень» был записан со слов Кученковой Дарьи Макаровны 1906 – 2004г. д. Забелышин.**